# Бясспрэчныя і неацэнныя сведчанні гісторыі

***Напярэдадні святкавання 75-годдзя перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне Нацыянальная бібліятэка Беларусі прадставіла новы інтэрнэт-праект – сайт «Падпольны і партызанскі друк Беларусі».***

Рэсурс уяўляе сабой электронную бібліятэку дакументаў, створаных падпольнымі і партызанскімі атрадамі, з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. Гэтая электронная бібліятэка пастаянна папаўняецца.

Сайт налічвае каля 100 найменняў газет, больш за 1 000 іх выпускаў, каля 150-і лістовак і рукапісных матэрыялаў. Дакументы ўяўляюць вялікую цікавасць для даследчыкаў, дазваляюць вывучаць гісторыю партызанскага руху ў Беларусі, жыццё краіны на акупаванай тэрыторыі. Дзякуючы праекту чытач зможа ўбачыць на ўласныя вочы бясспрэчныя сведчанні гісторыі і прыняць непасрэдны ўдзел у папаўненні калекцыі электроннымі копіямі дакументаў ваеннага перыяду з асабістых архіваў.

Інтэрнэт-праект «Падпольны і партызанскі друк Беларусі» дазволіць узнавіць і захаваць гісторыю ўсенароднага подзвігу, а таксама далучыць да яе шырокую аўдыторыю.

На акупаванай тэрыторыі БССР дзейнічалі падпольныя абкамы, гаркамы, райкамы і партыйныя арганізацыі КП(б)Б, якія кіравалі дзейнасцю партызанскіх атрадаў і брыгад, а таксама падпольныя камсамольскія і антыфашысцкія арганізацыі. Пытаннямі друку займаліся падпольныя партыйныя камітэты. У выніку напружанай арганізацыйнай працы ён атрымаў магутнае развіццё. Галоўным яго прызначэннем стала мабілізацыя народа на барацьбу з акупантамі і садзейнічанне пашырэнню і ўзмацненню партызанскага руху. На тэрыторыі Беларусі дзейнічала 10 абласных і 50 раённых падпольных друкарняў. На перыяд акупацыі ў БССР выдавалася больш за 160 найменняў газет.




***Паводле матэрыялаў аддзела суправаджэння інтэрнэт-партала nlb.by***